# Бабуля захварэла

*Іван Муравейка*

Вясну забаўляюць птушыныя трэлі,
У квецені — яблыні, вішні і слівы…
І толькі бабуля мая захварэла,
Ляжыць на канапе маўкліва, тужліва.

На лоб на яе я паклала далоні:
«Бабуля, бабуля, ты ўся аж палаеш».
Яна ж: «Супакойся, унучка Алёна,
Я проста стамілася, бо я — старая».

«Няпраўда, — кажу я. — Хіба ж ты старая?»
Заплакала б я, ды бабулю ўзрушу.
І я ёй вясёлыя песні спяваю —
Пра поле, пра рэчку, пра сад наш, пра птушак.

Бабуля ўсміхнулася. Ёй стала лепей.
Няўжо мае песні — найлепшыя лекі?